# Уладзімір Гаўрылавіч Колб (1929 г.), вучоны ў галіне клінічнай біяхіміі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі



Уладзімір Гаўрылавіч Колб нарадзіўся 12 сакавіка 1929 года ў вёсцы Лемяшэвічы Пінскага раёна. З адзнакай закончыў Пінскую фельчарска-акушэрскую школу і ў 1949 годзе паступіў у Мінскі медыцынскі інстытут. З другога курса захапіўся навукова-даследчай працай і актыўна займаўся ў навуковым кружку пры кафедры агульнай хіміі пад кіраўніцтвам вучонага В.А.Бандарына. Пасля заканчэння інстытута ў 1955 годзе быў прыняты ў аспірантуру на кафедру біяхіміі. Кандыдацкую дысертацыю абараніў у 1960 годзе, працуя старшым навуковым супрацоўнікам Беларускага Навукова-даследчага інстытута (НДІ) туберкулёзу. З гэтага часу займаўся арганізацыяй лабараторнай службы ў процітуберкулёзных установах Рэспублікі Беларусь. З 1967 г. - галоўны спецыяліст па клінічнай лабараторнай дыягностыцы рэспублікі.

У 1970 годзе абараніў доктарскую дысертацыю на тэму: «Биохимические и биофизические аспекты изучения реактивности организма при туберкулезе».

У.Г.Колб упершыню арганізаваў у рэспубліцы 6 абласных, Мінскае гарадское і Рэспубліканскае навуковыя таварыствы ўрачоў-лабарантаў. У 1970 годзе ў Беларускім інстытуце ўдасканалення ўрачоў ім арганізавана кафедра клінічнай лабараторнай дыягностыкі, якой ён нязменна кіраваў на працягу 29 гадоў.

У 1972 годзе загадчыку кафедры В. Г. Колбу прысвоена вучонае званне прафесара, а ў 1990 г. - Заслужанага дзеяча навукі БССР. Сярод яго вучняў 3 дактары і 12 кандыдатаў медыцынскіх і біялагічных навук.

Напрамкі яго навуковай дзейнасці: праблемы рэактыўнасці арганізма пры туберкулёзе, арганізацыя лабараторнай службы ў медыцынскіх установах Рэспублікі.

Ён - аўтар 360 навуковых прац па біяхіміі і імуналогіі, лёгачнай і сардэчнай паталогіі, дыягностыцы і метадах даследавання ў нефралогіі і уралогіі, хірургічных захворванняў, у тым ліку 10 манаграфій і 28 метадычных рэкамендацый; сааўтар 12 пасведчанняў на вынаходства і 38 пасведчанняў на рацпрапановы. Аўтар манаграфій "Біяфізічныя аспекты рэактыўнасці арганізма пры туберкулёзе" (1971 г., 1974 г.), "Даведнік па клінічнай хіміі" (у сааўтарстве, 1982 г.), "Методы даследавання ў нефралогіі і ўралогіі" (у сааўтарстве, 1992 г.), даведачнай дапамогі "Лабараторная дыягностыка хірургічных захворванняў" (у сааўтарстве, 1993 г.), дапамогі для ўрачоў-лабарантаў "Клінічная біяхімія" (у сааўтарстве, 1993 г.).

Неаднаразова ўдзельнічаў у міжнародных, усесаюзных, рэспубліканскіх з'ездах, канферэнцыях і семінарах.

На працягу 25 год быў галоўным спецыялістам па клінічнай лабараторнай дыягностыцы рэспублікі, 29 год выбіраўся старшынёй, а затым прэзідэнтам Беларускага навукова-практычнага таварыства спецыялістаў клінічнай лабараторнай дыягностыкі.

Кіраваў правядзеннем 5 Рэспубліканскіх з'ездаў, больш за 40 пленумаў, канферэнцый, сімпозіўмаў, семінараў. Выбіраўся старшынёй, прэзідэнтам Беларускага навукова-практычнага таварыства спецыялістаў клінічнай лабараторнай дыягностыкі, членам праўлення Усесаюзнага навуковага таварыства. З 1992 года - член Савета навуковага таварыства клінічнай лабараторнай дыягностыкі краін СНД.

У.Г.Колб - член рэдкалегіі журнала "Ахова здароўя" і рэдакцыйнага савета журнала "Клінічная лабараторная дыягностыка" (Расія), праўлення Беларускага біяхімічнага таварыства, Прэзідыума Савета навуковых таварыстваў, член 3-х спецыялізаваных Саветаў па абароне дысертацый і Рэспубліканскіх атэстацыйных камісій, з'яўляўся старшынёй секцыі медыка-біялагічных навук і членам бюро Рэспубліканскага міжведамаснага навуковага савета па развіцці фундаментальных даследаванняў для медыцыны пры Акадэміі Навук БССР.

За заслугі ў развіцці аховы здароўя, актыўную навукова-педагагічную і арганізатарскую дзейнасць прафесар У.Г.Колб узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, значком "Выдатніку аховы здароўя", медалём "Ветэран працы", прысвоена ганаровае званне "Заслужаны дзеяч навукі БССР". Мае рад падзяк і Ганаровых грамат ад міністэрстваў аховы здароўя СССР, Рэспублікі Беларусь і БелМАПО.


1. **Колб, В. Г.** Исследование прижизненных физико-химических свойств и реактивности кожи : автореф. дис. на соискание ученой степени канд. мед. наук / В. Г. Колб ; Мин. гос. мед. ин-т. – Минск, 1959.–С. 18 .
2. **Вопросы** лабораторной диагностики : тезисы докладов к 1-й республиканской конференции врачей-лаборантов (декабрь 1968 года) / [редкол.: В.Г.Колб (отв. ред.) и др.] . - Минск, 1968.– С. 130.
3. **Колб, В. Г.** Биохимические и биофизические аспекты изучения реактивности организма при туберкулезе : автореф. дис. д-ра мед. наук / В. Г. Колб ; НИИ эксперим. и клинич. медицины. – Вильнюс, 1969.– С.49.
4. **Колб, В. Г.** Биохимические аспекты реактивности организма при туберкулезе / В. Г. Колб. – Минск : Беларусь, 1971.– С. 143.
5. **Колб, В. Г.** Биофизические аспекты реактивности организма при туберкулезе / В. Г. Колб.– Минск : Беларусь, 1974.– С. 136.

6. **Вопросы** лабораторной диагностики : тезисы докладов І-го республиканского съезда врачей-лаборантов (май 1975 год) / [редкол. : В. Г. Колб (отв. ред.) и др.].–Минск, 1975.– С. 244, [1].
7. **Колб, В. Г.** Клиническая биохимия : пособие для врачей-лаборантов / В. Г. Колб, В. С. Камышников.– Минск : Беларусь, 1976. – С. 312.
8. **Вопросы** лабораторной диагностики: тезисы докладов ІІ-го республиканского съезда врачей-лаборантов (октябрь 1981 год) / [редкол. : В. Г. Колб (отв. ред.) и др.]. – Минск, 1981. – С. 198.
9. **Колб, В. Г.** Справочник по клинической химии / В. Г. Колб, В. С. Камышников. – 2-е изд., перераб. – Минск : Беларусь, 1982. – С. 366.
10. **Колб, В. Г.** Клинико-биохимические исследования в педиатрии / В. Г. Колб, В. С. Данильчик ; Белорусский гос. ин-т усовершенствования врачей Минздрава СССР, каф. клинической лабораторной диагностики. – Минск, 1982. – С. 366.
11. **Зелезинская, Г. А.** Витамины и возраст / АН БССР, Сектор геронтологии / Г. А. Зелезинская ; науч. ред. В. Г. Колб. – Минск : Наука и техника, 1983. – С. 75, [3].
12. **Чиж, А. С.** Методы исследования в нефрологии и урологии / А. С. Чиж, В. С. Пилотович, В. Г. Колб. – Минск : Выш. шк., 1992. – С. 415. : ил. – Библиогр. : С.409
13. **Четвертый** научный съезд специалистов по клинической лабораторной диагностике Республики Беларусь : тезисы докл., 17-18 сент. 1992 г. / редкол. : В. Г. Колб (отв. ред.) и др.– Гродно, 1992. – С. 232.
14. **Колб, В.Г.** Лабораторная диагностика хирургических заболеваний : справ. пособ. / В. Г. Колб, В. С. Камышников.– Минск : Выш. шк., 1993. – С. 186.
15. **Нефрология** и урология : учеб. пособие / А. С. Чиж, В. С. Пилотович, В. Г. Колб.– Минск : Кн. дом, 2004.– С. 462, [1].
16. **Баратова, Л.А.** Тритиевая планиграфия биологических макромолекул / Л. А. Баратова ; отв. ред. А. В. Шишков. – М. : Наука, 1999. – С. 174, [1] : ил., табл. – Авт. указаны на обороте тит. л. (среди авт.: Колб, В.Г.(доктор медиц. наук)). – Библиогр. в конце глав.

17. **Колб** Уладзімір Гаўрылавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Мінск, 2004. Т.8.– С.388
18. **Колб** Владимир Гаврилович // Республика Беларусь: энциклопедия: в 7 т. - Минск, 2007. Т.4. – С.138
19. **Колб** Владимир Гаврилович // Учёные Пинщины: [справ. издание] / авт.-сост. И. А. Кибак, П. Н. Синкевич, В. В. Василевицкий. Пинск : Пин. регион. тип., 2012. – С.63
20. **Колб** Уладзімір Гаўрылавіч // Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003.– С.484
21. **Демидчик, Ю.Е.** Кафедре клинической лабораторной диагностики Белорусской медицинской академии последипломного образования 40 лет

[упоминается Владимир Гаврилович Колб] / Ю. Е. Демидчик // Медицина. 2010. №1. – С.28-30.
22. **12 марта -** 80 лет со дня рождения Владимира Гавриловича Колба // Здравоохранение Беларуси. Знаменательные и юбилейные даты. 2009 : спец. выпуск информ. сборника, посв. 90-летию со дня основания Министерства здравоохранения Республики Беларусь / сост. Н. Ф. Змачинская, Л. В. Хлус. Минск, 2009.– С. 53
23. **Колб** Владимир Гаврилович (биохимия, гематология; 19290312) // Руководители, заведующие кафедрами, профессора и доктора наук Белорусской медицинской академии последипломного образования (1931-2006) / ред. комиссия: Г. Я. Хулуп [и др.]. Минск: БелМАПО, 2006.– С. 135-136.
24. **О награждении** В.Г.Колба Почетной грамотой Национального собрания Республики Беларусь : Постановление Президиума Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь от 13 июня 2003 г. № 478-ПСР2 // Банк данных «Законодательство Республики Беларусь»
25. **Владимир** Гаврилович Колб: (к 70-летию со дня рождения) // Здравоохранение. 1999. №3.– С.59
26. **Ученый**, организатор, педагог : [доктор медицинских наук, профессор В. Г. Колб] // Пинская неделя. 1999.– 26 марта.
27. **Колб** Владимир Гаврилович // Пинская неделя. 1997.– 24 января.
28. **Патенты** автора. Колб Владимир Гаврилович //http://www.findpatent.ru/byauthors/1412203/ (11 патентов)
29. **Памяти профессора** В.Г. Колб [Электронный ресурс] / Камышников // Лабораторная диагностика Восточная Европа .— 2014 .— №4 .— С. 162-163 .— Режим доступа: https://rucont.ru/efd/494738
30. **Владимиру Гавриловичу** Колбу – 85 лет [Электронный ресурс] / Лабораторная диагностика Восточная Европа .— 2014 .— №2 .— С. 159-160 .— Режим доступа: https://rucont.ru/efd/494577
**31.Колб, В. Г.** Клиническая биохимия [Текст] : (Пособие для врачей-лаборантов) / В. Г. Колб, проф., В. С. Камышников, канд. мед. наук. - Минск : Беларусь, 1976. – С. 311 с. : ил.; 21 см.